# Невядомая Налібоцкая пушча

СТАРАЖЫТНЫ ЛЕС ДАГЭТУЛЬ ЗАХОЎВАЕ ГІСТАРЫЧНЫЯ РЭЛІКВІІ І ПРЫРОДНЫЯ РЭЛІКТЫ

Па дарозе з Мінска на Вільнюс і Гродна цягнецца вялізны лясны масіў. Зрэдку з-за верхавін дрэў мільгане вежка касцёла або царквы. Затое вельмі часга з боку дарогі сустра-каюцца паказальнікі на населеныя пункты. Архаічныя вёскі і старажытныя гарады літаральна "схаваныя" ў Налібоцкай пушчы.

## ТУТ БЫЎ ДЖЭЙМС БОНД

Гісторыкі сцвярджаюць: некалі ў пушчы, за Заслаўем, апошнім горадам старажытнай хрысціянскай Белай Русі, пачыналіся паселішчы язычнікаў літоўцаў. Аб гэтым гавораць захаваныя дагэтуль балційскія назвы вёсак.

А ў 1941—1944 гадах у нетрах вялікага лесу збіраліся на барацьбу супраць нацыстаў партызаны. Усе гэтыя эпізоды мінулага не забытыя.

Уздоўж дарог вы ўбачыце мноства мемарыяльных стэл. А вядомы роляй Джэймса Бонда акцёр Дэніел Крэйг зняўся некалькі гадоў назад у фільме”Выклік”, прыс-вечаным драматычнай гісторыі партызанскага атрада братоў Бельскіх, што ў вайну выратаваў у Налібоцкай пушчы жыцці 1200 яўрэям, якія хаваліся ў лесе ад нацыстаў.

Яшчэ адзін цікавы факт з мінулага: пад Івянцом нарадзіўся заснавальнік савецкіх спецслужбаў, папярэднік КДБ, Фелікс Дзяржынскі. У гэтым жа гарадку знаходзіцца дом Апалінарыя Пунко — яшчэ аднаго мясцовага чалавека-легенды. Гавораць, у 1917 годзе ў яго некаторы час жыў заснавальнік беларускай міліцыі Міхаіл Фрунзе. Нашчадкі Пупко ператварылі яго дом у музей і аграэкасядзібу.

— Апалінарый Фларыянавіч вядомы як аўтар незвычайных скульптур. Сцены, дзверы, столі свайго дома ён пакрыў непаўторнымі роспісамі, — малодшая дачка Соф'я Апалінар'еўна пра бацьку ганорыць з павагай. — Шмат чаго ен ведаў, але панёс гэтыя звесткі з сабою. Замкнуты, як і большасць жыхароў Налібоцкага краю, ен не вельмі любіў гаварыць адкрыта. Але калі вы неабыякавыя да самабытнай беларускай культуры, то абавнзкова зазірніце ў наш дом-музей.

## ХРУСТАЛЬ АД ГАННЫ РАДЗІВІЛ

У Івянцы ёсць яшчэ адзін музей — краязнаўчы і два найпрыгажэйшыя касцелы — Чырвоны пачаткуXX стагоддзя і Белы XVII стагоддзя.

Калі ў івянецкіх музеях вам пакажуць вырабы народнай творчасці, то гэта будзе няпоўнай карцінай чалавечай цывілізацыі ў пушчы. Тут зараджалася сучасная прамысловас ць Беларусі.



Налібоцкая пушча параўнальная з расійскім Уралам.

Захаванне такога велічэзнага лесу побач з густанаселенымі раёнамі краіны тлумачыцца надзвычай неўрадлівымі глебамі, якія стагоддзямі рабілі тут земляробства эканамічна нявыгадным. Спробы раскарчаваць лес пад ворыва цалкам не акупляліся. Таму спецыялізацыяй рэгіёну сталі здабыча і перапрацоўка карысных выкапняў: балотнай жалезнай руды, гліны, кварцавага пяску. Паступова з дробных саматужных промыслаў узнікалі буйныя прамысловыя прадпрыемствы. Заснаванне многіх з іх звязана з іменем прадпрымальніцы Ганны Радзівіл. Налібоцкі шкляны завод ("гута") праславіўся яшчэ ў XVIII стагоддзі. Хрусталь мануфактуры ўпрыгожвае буйнейшыя музеі свету нараўне з яйкамі Фабержэ.

## ОПЕРА"ЛЕБЕДЗЯ"

У 1840 годзе жыхар Мінска Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч прадаў сваю гарадскую маёмасць і пераехаў у пушчу — у сядзібу Люцінка. Маёнтак знаходзіўся каля дарогі, пра яго і цяпер нагадваюць захаваныя прыступкі, якія вядуць ад асфальтавай трасы да помніка Дуніну-Марцінкевічу. Ён увайшоў у гісторыю як першы, хто прафесійна займаўся напісаннем мастацкіх твораў на беларускай мове. Паводле п'есы Марцінкевіча "Сялянка" ў Мінску была

пастаўлена першая беларуская опера — у будынку, што стаяў на месцы цяперашняга гатэля "Еўропа".
У Люцінцы літаратар пражыў 40 гадоў і напісаў большасць сваіх твораў. Тут былі гасцямі пісьменнік Уладзіслаў Сыракомля, кампазітар Станіслаў Манюшка, скрыпач Канстанцін Крыжаноўскі, гісторык Аляксандр Ельскі, мастак Ян Дамель, краязнаўца Канстанцін Тышкевіч, Гэтыя імёны ведае кожны адукаваны чалавек не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы і Літве. А вучнем школы, якую адкрыў Дунін-Марцінкевіч у сваім доме, быў беларускі пісьменнік Антон Лявіцкі, больш вядомы пад псеўданімам Ядвігін Ш.
“Дом з хваёвага дрэва, пад гонтай. Ганак з порцікам, вокны з аканіцамі", — так апісвае сядзібу пісьменніка архіўны дакумент. Па вобразе і падабенстве маёнтка класіка пабудаваў па суседстве свой дом гісторык і прадпрымальнік Аляксандр Белы. У яго вялікія планы ў пушчы.

**МУЗЕЙ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ**

Вядомыя і новыя пункты на карце пушчы ўвойдуць неўзабаве ў новы маршрут—яго распрацоўвае Аляксандр Белы. Мэта — стварыць экамузей "Бра-ма ў Налібокі", які будзе знаходзіцца не ў адным памяшканні, а злучыць розныя цікавыя аб'екты рэгіёну.
— Слова "экамузей" упершыню з'явілася ў Францыі ў мінулым стагоддзі, — раскаЗвае прадпрымальнік.
— Пад гэтым тэрмінам аб'ядноўваюцца ў адно цэлае прыродныя і гістарычныя помнікі, аб'екты інфраструктуры аднаго рэгіёну. Прычым мы не ствараем нічога прынцыпова новага, а толькі прыстасоўваем старажытныя комплексы пад патрэбнасці турыстаў. Больш за ўсё экамузеяў цяпер у Швецыі. Налібоцкі — аб'яднае ў адзін комплекс касцелы, сядзібы, капліцы, характэрныя сельскія пабудовы, па спецыяльных сцежках у лесе можна будзе прайсці да месцаў знаходжання рэдкіх жывёлін, да палян, дзе растуць кветкі і травы, занесеныя ў Чырвоную кнігу.
Адзін з самых незвычайных аб'ектаў будучага экамузея знаходзіцца ў вёсцы Вялае. Гэта руіны сядзібы магнатаў Тышкевічаў. Побач захавалася дуброва з 200—400-гадовых дубоў. А ў палацы некалі была лабараторыя графа Бенедыкта Тышкевіча — піянера фатаграфіі ў Літве і Беларусі.
У Налібоцкай пушчы ўжо цяпер працуе некалькі турыстычных маршрутаў. І каб праехаць па ўсіх іх, патрэбны не дзень, не два, а тыдзень. Напрыклад, варта пабываць у Вішнева. І паспрабаваць ваду з калодзежа ў двары дома, дзе нарадзіўся цяперашні прэзідэнт Ізраіля Шымон Перэс. Або зазірнуць у суседні касцел, дзе, паводле легенды, пахаваны аўтар першай куігі, выдадзенай на беларускай мове на тэрыторыі Беларусі, Сымон Будны. У храме вас уразіць мноства скульптур у стылі барока. Усе яны захаваліся з XVII стагоддзя. А калі праехаць крыху далей — да вёскі Багданава, то патрапіце ў сядзібу мастака Фердынанда Рушчыца. Налібоцкая пушча толькі з выгляду дзікая. Тут захавалася шмат культурных артэфактаў, якія вартыя таго, каб іх убачыць.

***Віктар Корбут***

**Источник:** Беларусь.-2012.-№ 3.-С.22-23.